УДК [947.6-15+338.43.02(476-15=38)(091)]«1941/1944»

С. Л. Казлова, канд. гіст. навук, ІГ НАН Беларусі

# УДЗЕЛ БЕЛАРУСАЎ У САВЕЦКА-ЯПОНСКАЙ ВАЙНЕ 1945 ГОДА: ДА 65-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ

The article is concentrated on questions of participation of Belorussians and natives of Belarus in the Soviet-Japanese war of 1945. Byelorussians actively participated in military actions of Transbaikalian, 1st and 2nd Far East fronts, and also Pacific fleet which have been directed against militaristic Japan. Stages of diplomatic preparation of war, and also the reason on which Japan continued military resistance are considered. Plans of the Soviet command on carrying out of military operations are analyzed. The role of participation of Belorusians in the war is underlined, and fragments from their personal memoirs are presented.

**Уводзіны.** У верасні 2010 г. нас чакае юбілейная дата – 65 год з дня заканчэння Другой сусветнай вайны, якая непасрэдна звязана з разгромам мілітарысцкай Японіі. Уступленне Савецкага Саюза ў вайну супраць Японіі на баку саюзнікаў было цалкам заканамерным. У гэтым былі зацікаўлены саюзнікі, якія лічылі, што без дапамогі СССР яны змогуць прымусіць капітуляваць Японію не раней чым у 1947 г. [1, с. 388]. У пагадненні трох дзяржаў – Вялікабрытаніі, ЗША і СССР, якое было падпісана 11 лютага 1945 г., адзначалася, што праз два-тры месяцы пасля капітуляцыі Германіі і заканчэння вайны ў Еўропе Савецкі Саюз уступіць у вайну на баку саюзнікаў [2, с. 199–200].

Пасля паражэння і разгрому фашысцкай Германіі ўрад Японіі працягваў заклікаць да вайны да пераможнага канца. У супрацьлегласць сваім ранейшым устаноўкам ён зрабіў спробу пераканаць народ у тым, што вайна Германіі не мела ніякіх адносінаў да вайны на Далёкім Усходзе і што капітуляцыя гітлераўцаў не адбілася на становішчы Японіі [3, с. 534].

26 ліпеня 1945 г. была апублікавана Патсдамская дэкларацыя з подпісамі ЗША, Англіі і Кітая. Савецкі Саюз у той момант не мог падпісаць дэкларацыю, таму што не быў у стане вайны з Японіяй [1, с. 392]. Патсдамская дэкларацыя, якая насіла ультыматыўны характар, змяшчала ўмовы капітуляцыі, якія прадугледжвалі: ліквідацыю ў Японіі ўлады і ўплыву мілітарыстаў; акупацыю японскай тэрыторыі; абмежаванне суверэнітэту Японіі астравамі Хансю, Хакайда, Кюсю, Сікоку; пакаранне ваенных злачынцаў і г. д. [3, с. 539]. Савецкі ўрад далучыўся да Патсдамскай дэкларацыі і заявіў 8 жніўня, што з 9 жніўня будзе лічыць сябе ў стане вайны з Японіяй [4, с. 419].

На пачатак баявых дзеянняў на Далёкім Усходзе былі разгорнуты сілы трох франтоў: Забайкальскага, 1-га і 2-га Далёкаўсходніх. Яны і павінны былі ва ўзаемадзеянні з Ціхаакіянскім флотам і Амурскай рачной флатыліяй выконваць задачы, якія стаялі перад савецкімі ўзброенымі сіламі на Далёкім Усходзе. Было створана Галоўнае камандаванне савецкіх войск на Далёкім Усходзе. Галоўнакамандуючым быў прызначаны маршал Савецкага Саюза А. М. Васілеўскі. Каардынацыя дзеянняў Ціхаакіянскага флоту і Амурскай ваеннай флатыліі з наземнымі войскамі ўскладалася на Галоўнакамандуючага ваенна-марскімі сіламі адмірала флоту М. Г. Кузняцова. Кіраўніцтва авіяцыяй павінен быў ажыццяўляць камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі галоўны маршал авіяцыі А. А. Новікаў.

Войскі Забайкальскага фронту – камандуючы маршал Савецкага Саюза Р. Я. Маліноўскі – павінны былі галоўны ўдар нанесці ў накірунку на Чаньчунь і выйсці на рубеж Чжаланьтунь – Чаньчунь – Мукдэн – Чыфын.

Войскі 1-га Далёкаўсходняга фронту – камандуючыя маршал Савецкага Саюза К. А. Мерацкоў, член Ваеннага савета генерал-палкоўнік Ц. Ф. Штыкаў – павінны былі нанесці галоўны ўдар з раёна Градэкава ў агульным накірунку на Мулін, Муданьцзян. У далейшым войскам трэба было выйсці на лінію Харбін – Чаньчунь – Ранан. 2-му Далёка-ўсходняму фронту – камандуючы генерал арміі М. А. Пуркаеў – Стаўка загадала нанесці ўдар на Харбін ва ўзаемадзеянні з Амурскай рачной флатыліяй. Ціхаакіянскі флот – камандуючы адмірал І. С. Юмашаў – павінен быў парушаць марскія зносіны праціўніка ў Японскім моры, ускладніць базіраванне варожых караблёў на парты Паўночнай Карэі (Юкі, Расін, Сейсін), не дапусціць высадкі японскага дэсанта на савецкае ўзбярэжжа. Такім чынам, наступленне супраць Квантунскай арміі рыхтавалася як стратэгічная аперацыя трох франтоў і флоту [3, с. 550–553].

**Асноўная частка.** 9 жніўня 1945 г. пачалося наступленне Чырвонай Арміі. Рух савецкіх войск ажыццяўляўся высокімі тэмпамі. Асабліва хутка наступалі войскі Забайкальскага фронту. Ужо 12 жніўня злучэнні 6-й гвардзейскай арміі перайшлі Вялікі Хінган і пайшлі на ключавыя цэнтры Маньчжурыі – Чанчунь і Мукдэн. Насустрач Забайкальскаму фронту наступалі ўдарныя часткі 1-га Далёкаўсходняга фронту. У ходзе наступлення сухапутныя войскі цесна ўзаемадзейнічалі з караблямі Ціхаакіянскага флоту. З іх дапамогай паспяхова ажыццяўляўся шэраг дэсантных аперацый ў партах Паўночнай Карэі – Юкі, Расін, Сейсін і інш.

Супраціўленне Квантунскай арміі было зломленае. Многія яе часці папалі ў акружэнне і страцілі баяздольнасць. У гэтым крытычным становішчы японскі ўрад 14 жніўня прыняў рашэнне аб капітуляцыі на ўмовах Патсдамскай дэкларацыі і паведаміў аб гэтым урадам ЗША, СССР і Англіі. Аднак імператарская армія працягвала змагацца супраць злучэнняў Чырвонай Арміі. Генштаб вымушаны быў выступіць са спецыяльным тлумачэннем, у якім падкрэслівалася, што савецкія войскі будуць працягваць наступленне, пакуль японскія войскі не складуць зброю. Наступленне Чырвонай Арміі імкліва развівалася, і да 20 жніўня разгром Квантунскай арміі быў практычна завершаны. У сувязі з поспехам у Маньчжурыі 2-гі Далёкаўсходні фронт перайшоў у наступленне на Сахаліне. Заключным этапам вайны супраць Японіі з'явілася Курыльская дэсантная аперацыя, праведзеная часткай сіл 1-га і 2-га Далёкаўсходняга франтоў і Ціхаакіянскага флоту. Яна пачалася ў ноч з 16 на 17 жніўня з высадкі савецкага марскога дэсанта на востраве Шумшу – самым паўночным у Курыльскайградзе. Тут японцы мелі моцную сістэму берагавой абароны. Бітва за Шумшу працягвалася некалькі дзён і была вельмі цяжкай. Урэшце японцы не вытрымалі націску і адступілі. Праз некаторы час гарнізон вострава Шумшу капітуляваў. Такім чынам, японцамі быў згублены ключавы вузел абароны Курыльскай грады, за якім адбылася капітуляцыя гарнізонаў астатніх астравоў [5, с. 250].

2 верасня 1945 г. ў Такійскай бухце на борце амерыканскага лінкора «Місуры» адбылася цырымонія падпісання Акта аб капітуляцыі. Згодна гэтаму дакументу Японія прымала ўмовы Патсдамскай дэкларацыі ад 26 ліпеня 1945 г. і заяўляла аб неадкладнай капітуляцыі ўсіх сваіх узброеных сіл [6, с. 480]. Другая сусветная вайна на гэтым скончылася.

Удзел беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі ў савецка-японскай вайне 1945 г. не быў прадметам асобнага разгляду айчынных гісторыкаў. Прычына, перш за ўсё, у недасягальнасці для беларускіх даследчыкаў архіўных матэрыялаў – яны знаходзяцца ў архівах Расійскай Федэрацыі. Пры працы над дадзенай тэмай выкарыстоўваліся матэрыялы апублікаваных крыніц, а таксама айчыннай перыёдыкі.

Намі было выяўлена, што ўсяго за баявыя подзвігі ў савецка-японскай вайне 1945 года 5 беларусам было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза – М. У. Барташову, Г. С. Здановічу, В. А. Кату, М. А. Ласкунову, Ц. А. Пачтарову [7, с. 65].

Перш за ўсё неабходна сказаць пра беларуса Барташова Макара Уласавіча. З 9 да 17 жніўня 1945 г. 12-я штурмавая марская авіядывізія пад камандаваннем палкоўніка М. У. Барташова наносіла масіраваныя ўдары па часцях японскай Квантунскай арміі ў партах Юкі, Расін, Сейсін, на чыгуначных станцыях Фуней, Тумань. Ліквідавала 24 караблі і транспарты праціўніка водазмяшчэннем 47 тыс. т, 11 эшалонаў, 5 самалётаў, 4 масты, 7 артылерыйскіх батарэй, 8 складоў, 2 паравоза, 70 вагонаў, электрастанцыю, дэпо, каля 2,6 тыс. салдат і афіцэраў праціўніка. М. У. Барташоў асабіста патапіў японскі танкер [8, с. 43].

Таксама неабходна адзначыць беларуса, генерал-майора Здановіча Гаўрыіла Станіслававіча, які ў час ВАВ з 1941 г. быў начальнікам аператыўнага аддзела корпуса, начальнікам штаба дывізіі, намеснікам камандзіра дывізіі. Камандзір стралковай дывізіі Г. С. Здановіч вызначыўся ў баях з японцамі ў жніўні 1945 г. 203-я стралковая дывізія пад яго камандаваннем удзельнічала ў наступальнай аперацыі ў Маньчжурыі. У жніўні 1945 г. дывізія Здановіча ажыццявіла 1500-кіламетровы марш праз бязводныя стэпы. Робячы маршы па 50 і больш кіламетраў ў суткі па цяжка-праходнай мясцовасці, пераадолела горы Вялікага Хінгана, фарсіравала раку Ляахэ і выйшла ў раён горада Фусінь [8, с. 184].

Актыўным удзельнікам вайны з Японіяй 1945 г. з'яўляецца беларус Пачтароў Цімафей Аляксеевіч. 18 жніўня 1945 г. батальён марской пяхоты пад камандаваннем маёра Ц. А. Пачтарова паспяхова высадзіўся на адзін з Курыльскіх астравоў – востраў Шумшу. Батальён захапіў прыбярэжныя абарончыя збудаванні, штаб варожага батальёна, адбіў тры контратакі праціўніка, чым забяспечыў плацдарм для высадкі галоўных сіл дэсанта. Імем адважнага беларуса названы мыс на востраве Шумшу [8, с. 424].

Цікавая ваенная біяграфія і ў беларуса, актыўнага ўдзельніка вайны з Японіяй Ласкунова Мікалая Аляксеевіча. Намеснік начальніка аператыўнага аддзела штаба арміі падпалкоўнік М. А. Ласкуноў вызначыўся 11 жніўня 1945 г. З важным баявым загадам Ваеннага Савета арміі ён вылецеў ў злучэнне, якое вяло бой з часцямі японскай Квантунскай арміі за горад Фуцзінь (Кітай). Ласкуноў добра разумеў усю важнасць сваёй місіі. Фуцзінь – адзін з гарадоў на пуці ў Харбін – японцы ператварылі ў моцную крэпасць. Яны разлічвалі спыніць тут нашы войскі і закрыць шлях караблям Амурскай флатыліі ў Харбін. Пры пасадцы самалёт быў падбіты. Цяжка паранены, М. А. Ласкуноў аддаў загад па назначэнні. У той самы дзень ён памёр ад ран. Пахаваны ў горадзе Фуцзінь [8, с. 311].

Праславіўся ў вайне з Японіяй і старэйшы лейтэнант беларус Кот Васіль Андрэевіч. Падчас дэсантнай аперацыі на Курыльскіх астравах ён першым высадзіўся на востраў Шумшу, замяніў параненага камандзіра і забяспечыў выкананне баявой задачы па аваладанні востравам.

Пазней ён стаў ганаровым грамадзянінам горада Паўночна-Курыльска Сахалінскай вобласці [8, с. 262].

Не можам не сказаць таксама пра непасрэднага распрацоўшчыка плана стратэгічнай аперацыі ў савецка-японскай вайне, беларуса, генерала арміі (1943 г.), начальніка Генштаба (1945 г.) Аляксея Інакенцьевіча Антонава. З жніўня 1941 г. ён займаў пасады начальніка штаба Паўднёвага, Паўночна-Каўказскага і Закаўказскага франтоў і Чарнаморскай групы войск. З снежня 1942 г. – першы намеснік начальніка Генштаба, з лютага 1945 г. – начальнік Генштаба. Быў удзельнікам Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцый [9, с. 94].

Намі былі знойдзены звесткі пра гераічнага ўдзельніка вайны з мілітарысцкай Японіяй, намесніка начальніка штаба 1-га Далёкаўсходняга фронту, беларуса, генерал-лейтэнанта Г. А. Шэлахава. Георгій Акімавіч Шэлахаў у гады Вялікай Айчыннай вайны быў начальнікам штаба артылерыі групы войск на Далёкім Усходзе, затым намеснікам начальніка штаба 1-га Далёкаўсходняга фронту. Па загадзе галоўнакамандуючага савецкімі войскамі на Далёкім Усходзе маршала А. М. Васілеўскага з мэтай хуткага захопу важнейшага стратэгічнага цэнтра Маньчжурыі г. Харбіна 18 жніўня 1945 г. генерал Г. А. Шэлахаў узначаліў паветраны дэсант (120 чалавек). Пасля высадкі савецкага дэсанта 45-тысячны гарнізон японскіх войск не аказаў узброенага супраціўлення. У той жа дзень, 18 жніўня, дэсантнікі генерала Г. А. Шэлахава сустрэлі на аэрадроме Харбіна начальніка штаба Квантунскай арміі генерал-лейтэнанта Х. Хата. Падчас перамоў з ім Г. А. Шэлахаў прапанаваў для ўзгаднення пытанняў, звязаных з капітуляцыяй усёй Квантунскай арміі, у суправаджэнні асоб, выбраных японскім камандаваннем, на савецкім самалёце адправіцца на камандны пункт камандуючага 1-м Далекаўсходнім фронтам. Х. Хата прыняў гэтую прапанову. У выніку перагавораў 19 жніўня камандаванне Квантунскай арміі аддало загад аб спыненні баявых дзеянняў. Толькі пасля гэтага ў Маньчжурыі пачалася масавая капітуляцыя японскіх войск [10, с. 688].

Гераічная біяграфія і ў актыўнага ўдзельніка вайны з Японіяй беларуса Гарчанкі Аляксандра Рыгоравіча. У жніўні 1945 г. батальён марской пяхоты, у якім служыў Гарчанка, вёў бой за вызваленне горада Сейсін ад японскіх захопнікаў. Рота аўтаматчыкаў авалодала важнай вышынёй. Японцы некалькі разоў контратакавалі. Не дасягнуўшы поспеху, вырашылі пайсці на хітрасць. Каля 200 чалавек пераапрануліся ў сялянскую вопратку, зайшлі ў тыл да нашых байцоў і адкрылі агонь. Гарчанка забяспечваў аўтаматчыкаў баепрыпасамі, не раз сам браўся за зброю, выручаючы таварышаў у самыя крытычныя моманты. Варожая куля ў гэтым баі абарвала жыццё нашага адважнага земляка [11, с. 535].

**Заключэнне.** Такім чынам, удзел беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі ў савецка-японскай вайне 1945 г., як мы бачым, быў вельмі актыўны. Нашы воіны-беларусы гераічна і самаахвярна змагаліся на Далёкім Усходзе за канчатковае спыненне самай крывавай за ўсю гісторыю чалавецтва вайны.

## Літаратура

1. Деборин, Г. А. Вторая мировая война. Военно-политический очерк / Г. А. Деборин. – М.: Воениздат, 1958. – 150 с.

2. Тегеран-Ялта-Потсдам: сборник документов. – 2-е изд. – М., 1970. – 248 с.

3. История Великой Отечественной войны Советского Союза 1941–1945 гг.: в 6 т. / М.: Воениздат, 1963. – Т. 5. Победоносное окончание войны с фашистской Германией. Поражение империалистической Японии (1945 г.). – 545 с.

4. Освободительная миссия советских вооруженных сил во второй мировой войне / под ред. маршала А. А. Гречко. – М.: Политиздат, 1974. – 378 с.

5. Война 1941–45 гг. Факты и документы / Е. Кульков, А. Ржешевский; под ред. профессора А. Ржешевского. – М.: Олма-Пресс, 2001. – 356 с.

6. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Минск, 2002. – 532 с.

7. Навечно в сердце народном. – Минск: Бел. сов. энциклопедия, 1984. – 380 с.

8. Большая советская энциклопедия. Т. 2. – М.: Советская энциклопедия, 1970. – 630 с.

9. Беларуская ССР. Кароткая энцыклапедыя. – Мінск, 1981. – Т. 5. Біяграфічны даведнік. – 480 с.

10. «Памяць»: Калінкавіцкі р-н: гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск: Ураджай, 1998. – 624 с.